# У ХОДЗЕ АБНАЎЛЕННЯ

## Наш субяседнік—Я. Я. САКАЛОЎ, член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі



**— Яфрэм Яўсеевіч, прайшло хоць і няшмнога часу пасля XXVIII з'езда КПСС, але дастаткова для таго, каб глыбей праанілізаваць яго рашэнні.**

— Матэрыялы з'езда дапамагаюць і яго дэлегатам, і мільёнам камуністаў авалодаць новым мышленнем. Новым мышленнем не як механічным працягам старога, а як адказам на выклік часу, як спосабам, метадам выкарыстання новай энергіі, што з'явілася ў партыі і грамадства. Сёння той КПСС, якой яна была ўчора, ужо няма. Ёсць партыя з шырокім плюралізмам думак. Тым не менш ёй працягваюць наклейваць старыя ярлыкі.

З'езд з усёй выразнасцю пацвердзіў, што партыя застаецца не проста авангарднай сілай перабудовы, але і галоўным гарантам ажыццяўлення дэмакратычных правоў, які не дапускае ні тармажэння працэсу пераўтварэнняў, ні яго безразважнага і правакацыйнага паскарэння па шляху капіталізацыі. Нікому не навязваючы новых ідэалагічных стэрэатыпаў, усім нам, камуністам, трэба шукаць шляхі практычнага стварэння гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму з тым, каб людзі пераконваліся ў перспектыўнасці нашага выбару.

шэнняў. Вострыя дыскусіі разгараліся не толькі вакол даклада М. С. Гарбачова, але і фраз тых ці іншых рэзалюцый. І гэта добра. Гэта цяпер павінна быць нормай — поўная шчырасць у выкладанні пазіцый, у іх адстойванні.

Наступны сур'ёзны ўрок — трэба рухацца наперад. Упарта, паслядоўна, развязваючы вузлы ў эканоміцы, экалогіі, ахове здароўя, адукацыі, нацыянальнай палітыцы, духоўнай сферы, у сітуацыі, звязанай з чарнобыльскай катастрофай. Упэўнены, што патрэбнасцю такога руху з'езд зарадзіў мільёны камуністаў. І аб'ядноўваючым момантам з'яўляецца тут недвухсэнсавая адданасць партыі дэмакратычнаму, гуманнаму сацыялізму.

Мяркую, што ў грамадстве яшчэ больш умацуюцца кансалідуючыя тэндэнцыі, калі ўсім стане ясна, што да капіталізму мы не пойдзем—ілюзіі тут небяспечныя! Мы пойдзем насустрач капіталістычнаму свету роўна настолькі, наколькі ён будзе паважаць нашу своеасаблівасць, сацыялістычны выбар нашых народаў, наколькі вырашыцца самкнуцца з намі ва ўзаемавыгадных, раўнапраўных сувязях. Гэта, канешне, палітыка не аднаго года. І спробы перарабіць нас на іншы лад, ці будуць яны зыходзіць знутры, ці звонку, не ўвянчаюцца поспехам.

Яшчэ адзін урок, бадай, галоўны — партыю трэба берагчы ад аслабленнем эканомікі, ды і пралікамі ў перабудовачны перыяд.

**— Ёсць, аднак, плыні, якія і пасля XXVIII з'езда КПСС нацэлены на яе палітычнае банкруцтва...**

— Ёсць. Не магу прыняць ультыматыўнага тону, з якім выступілі ў сярэдзіне ліпеня ў Маскве «Дэмакратычная Расія», «Дэмакратычная платформа ў КПСС», таварыства «Мемарыял» і іншыя. Істэрыка і пагрозы не паслужылі ні кансалідацыі, ні дэмакратыі, але, думаю, гэта дадасць грамадству рэалізму. Людзі бачаць, што насаджаецца разбуральная, антыдэмакратычная канцэпцыя не толькі ў партыі, але і ў грамадстве ў цэлым. У адпаведнасці з ёй даўно адладжаныя сувязі і ўзаемавыгадныя інтарэсы закрэсліваюцца. Віталецца поўнае раздзяленне Саюза, пры якім кожная рэспубліка захоплівала б «сваю долю». Тое ж прапаведуецца ў адносінах да рэгіёнаў, прадпрыемстваў.

Дрэнна, калі чалавек пазбаўляецца цвярозага розуму. А калі палітык губляе пачуццё рэалізму? Эканоміка не наладжана, злачыннасць расце, мараль падае, не гаснуць ачагі сепаратызму, шавінізму... У гэтай абстаноўцы адыход КПСС з палітычнай сцэны азначаў бы немінучы хаос. А мы ж краіна з атамнымі электрастанцыямі, ядзернай, хімічнай зброяй. Ці разумеюць гэта прыхільнікі распаду КПСС? Ці

ўмовы. А яшчэ ж Сакрат адзначыў, што можна прыняць закон аб пераўтварэнні аслоў у коней, указваючы тым самым, што заканатворчасць павінна адлюстроўваць рэальныя магчымасці. У нас жа даволі гучна чуюцца галасы тых, хто на словах асуджае камандна-адміністрацыйную сістэму, а на справе вельмі хацеў бы «кіраваць» яе метадамі.

**— На чым цяпер сканцэнтравана ўвага ЦК, партыйных камітэтаў і арганізацый Кампартыі Беларусі?**

— Праблем перад намі мноства. Напэўна, не зусім правільна спрабаваць раскласці ўсё па паліцах, маўляў, гэта — спачатку, а гэта — потым. Ці ж не першачарговай стала неабходнасць радыкальных эканамічных пераўтварэнняў, умацавання дысцыпліны? А становішча на спажывецкім рынку, сацыяльная перабудова сяла, рашэнне харчовай праблемы?

У рэспубліцы няма сёння палітычнай сілы, акрамя яе кампартыі, якая магла б узваліць на свае плечы ўвесь гэты груз і прапанаваць канкрэтныя праграмы дзеяння. З мэтай іх паспяховай рэалізацыі ЦК, партыйныя арганізацыі вядуць настойлівую работу па кансалідацыі ўсіх здаровых сіл грамадства. Для нас лепшы адказ на рознага роду нападкі, абвінавачванні, спробы запужвання, грубага націску з боку дэструктыўных сіл — цвёрдасць, спакой, цвярозасць ацэнак, глыбіня аналізу сітуацыі, г. зн. тое, што і павінна быць уласціва моцнай палітычнай партыі, якая выбрала свой шлях і ідзе па ім не збочваючы.

Цяпер мы ўступаем у паласу справаздач і выбараў у партыйных арганізацыях, пачына-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы